


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2015 ГОД

Падпіска на выданні ажыццяўляецца на дагаворнай аснове.

## Парадак заказу:

1. Запоўніце падпісныя дакументы:
- ЗАКАЗ на выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі;
- два экзэмпляры ДАГАВОРА на выраб друкаваных і электронных выданняў.
2. Афармленыя дакументы высылайце на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*пр. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкама, то дагавор павінен заключацца **паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і аддзелам культуры выканкама.**

Даведачныя тэлефоны выканаўцаў гл. на с. 15

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.: (+375 17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл. (+375 17) 293 28 12
Факс (+375 17) 266 37 23

У кіёску Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (за наяўны разлік)
Тэл. (+375 17) 293 28 52

РУП «Акадэмічная кніга»
Пр. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

ААТ «Белкніга»
Вул. Чыгуначная, 27а, 220089, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 222 89 45, 222 89 51

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ 12

Каляндарны план выхаду ў свет інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2015 г. 14

# Друкаваныя выданні

## 1. **Бібліятэчны веснік:** зборнік артыкулаў. Вып. 7

*Адказны за выпуск Пшыбытка М.Г.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка прысвечаны пытанням фарміравання сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы, перспектывам развіцця бібліятэк. У ім працягваецца публікацыя матэрыялаў па праблемах заканадаўчай базы бібліятэчнай практыкі, фарміравання і захоўвання інфармацыйных рэсурсаў, арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага і сацыякультурнага абслугоўвання карыстальнікаў, распрацоўкі і ўкаранення сучасных электронных сэрвісаў і тэхналогій. Разглядаюцца вынікі навуковых даследаванняў, пытанні прафесіяналізацыі бібліятэчных кадраў.

Зборнік артыкулаў з'яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі.

Прызначаны спецыялістам у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, выкладчыкам, аспірантам і магістрантам, кіраўнікам сферы культуры.

## 2. **Бібліятэчны свет:** часопіс*

*Галоўны рэдактар Кірухіна Л.Г.*




Часопіс, заснавальнікамі якога з'яўляюцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, выдаецца з мэтай навукова-практычнага і навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай справы, а таксама раскрыцця творчага і навуковага патэнцыялу спецыялістаў. Публікуюцца матэрыялы, якія адлюстроўваюць дзяржаўную культурную па-

---

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74895 (інд.), 748952 (вед.).

лiтыку, стан i перспектывы развiцця бiблiятэк розных сiстэм i ведамстваў, замежны вопыт.

Выдаецца штогод 6 разоў.

Прадстаўляе iнтарэс для тых, хто вывучае бiблiятэчную справу, гiсторыю, краязнаўства i культуру Беларусi.

## 3. **Георгiй Паплаўскi. Гравюры па творах Васiля Быкава:** камплект паштовак

*Адказны за выпуск* Суша А.А.



Камплект паштовак уключае рэпрадукцыi гравюр народнага мастака Беларусi, акадэмiка Георгiя Паплаўскага, створаных па сюжэтах класiчных твораў Васiля Быкава. Арыгiналы графiчных прац былi перададзены мастаком у фонды Нацыянальнай бiблiятэкi Беларусi. Выданне пачынае серыю «Кнiжная графiка Беларусi ХХ ст.», разлiчаную на ўсiх, хто цiкавiцца беларускай лiтаратурай i выяўленчым мастацтвам. Як дыдактычны матэрыял, яно палегчыць успрыняцце вучнямi i студэнтамi вядомых твораў айчыннага пiсьменства.

## 4. **Дзяцiнства светлая пара = Детства светлая пора = Happy Childhood:** камплект паштовак. Вып. 2

*Адказны за выпуск Масюк I.П.*




Першыя iлюстраваныя паштоўкi з'явiлiся ў Германii i Францыi ў 1870-я гг. Пачатак ХХ ст. стаў сапраўдным бумам выдання паштовак. Асаблiва папулярнасцю карысталiся паштоўкi з выявамi дзяцей. Фенаменальнае ажыўленне ў дадзеную тэматыку ўнесла пасляваенная масавая культура ў выглядзе патоку дзiцячых паштовак, якiя пасылалiся i прывозiлiся савецкiмi афiцэрамi. Менавiта да гэтай катэгорыi адносяцца паштоўкi, прадстаўленыя ў камплекце. Яркiя, прыгожыя, святочныя, яны паказваюць дзяцей у час сваiх любiмых заняткаў i гульняў. Гэты камплект толькi маленькая частка вялiкага

фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у якім налічваецца больш за 30 тыс. паштовак, розных па тэматыцы, прызначэнні, спосабе друку.

## 5. **Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі.** Вып. 18

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




У чарговым выпуску навуковага зборніка працягваецца публікацыя матэрыялаў па праблемах вывучэння, захоўвання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі кніжнай культуры. Зборнік артыкулаў з'яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі. Матэрыялы зборніка ўводзяць у навуковы ўжытак унікальныя дакументальныя помнікі, новыя дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі, і будуць карыснымі ўсім, хто цікавіцца нашай спадчынай.

## 6. **Кніжныя помнікі Беларусі**

*Адказны за выпуск Суша А.А.*




У выданні раскрываюцца змест і сутнасць паняцця «кніжны помнік», аналізуюцца асноўныя прынцыпы ідэнтыфікацыі і класіфікацыі кніжных помнікаў, асвятляюцца практычныя аспекты працы з імі ў бібліятэках, музеях, архівах, прыватных калекцыях, заснаваныя як на нацыянальным, так і замежным вопыце практычнай дзейнасці. Публікацыя прапануе адну з першых спроб абагульнення звестак пра гісторыю

фарміравання і сучасны стан фонду кніжных помнікаў нашай краіны.

Выданне скіравана на навуковае і метадычнае забеспячэнне работы па распрацоўцы Дзяржаўнага рэестра кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь. Будзе карысным для супрацоўнікаў бібліятэк, музеяў, архіваў, даследчыкаў, выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама ўсіх, хто цікавіцца нашай спадчынай.

## 7. **Мастацкая Скарынiяна: Мікалай Байрачны:** камплект паштовак

*Адказны за выпуск Суша А.А.*




Камплект паштовак уключае рэпрадукцыі твораў вядомага айчыннага мастака Мікалая Байрачнага, падрыхтаваных адмыслова для выдання А.К. Клышкі «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга» (Мінск, 1983). Серыя мастацкіх работ у яркіх вобразах ілюструе жыццё і творчую дзейнасць славутага беларускага асветніка Францыска Скарыны. Разлічана на мастакоў, даследчыкаў айчыннага выяўленчага мастацтва і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй беларускай культуры.

## 8. **Мастацкая Скарынiяна: Язэп Драздовіч:** камплект паштовак

*Адказны за выпуск Суша А.А.*



Камплект паштовак уключае рэпрадукцыі твораў знакамітага беларускага мастака і этнографа Язэпа Драздовіча, які лічыцца заснавальнікам беларускага нацыянальнага гістарычнага жывапісу. Выданне пачынае серыю «Мастацкая Скарыніяна», у межах якой будуць прадстаўлены творчыя інтэрпрэтацыі вобраза і спадчыны Францыска Скарыны – беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара. Разлічана на мастакоў, даследчыкаў айчыннага выяўленчага мастацтва і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй беларускай культуры.

## 9. Материалы III Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры»

*Ответственный за выпуск Есис Н.С.*




Сборник содержит материалы III Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», который в 2015 г. проводит Национальная библиотека Беларуси. Публикуются доклады известных специалистов национальных и крупнейших библиотек, научно-исследовательских учреждений, представителей других организаций, научных учреждений Беларуси и зарубежных стран, посвященные актуальным вопросам развития библиотечного дела.

Материалы публикуются в авторской редакции.

## 10. Матэрыялы XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




Зборнік складаецца з матэрыялаў XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія ў 2015 г. арганізуе Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Змяшчае даклады па гісторыі беларускай кніжнай культуры.

## 11. **Наталля Паплаўская. Гравюры па творах Івана Мележа:** камплект паштовак

*Адказны за выпуск Суша А.А.*



Камплект паштовак уключае рэпрадукцыі лінагравюр Наталлі Паплаўскай, створаных у 1964 г. адмыслова для першага ілюстраванага выдання «Палескай хронікі» Івана Мележа. Арыгіналы графічных прац былі перададзены мастаком у фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Выданне выпушчана ў серыі «Кніжная графіка Беларусі XX ст.» і разлічана на ўсіх, хто цікавіцца беларускай літаратурай і выяўленчым мастацтвам. Як дыдактычны матэрыял, яно палегчыць успрыняцце вучнямі і студэнтамі вядомых твораў айчыннага пісьменства.

## 12. **Новыя кнігі: па старонках беларускага друку****

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




Штомесячны ўніверсальны бібліяграфічны бюлетэнь інфармуе пра новыя кнігі беларускіх выдавецтваў, што паступілі ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, найбольш значныя артыкулы з рэспубліканскай перыёдыкі, а таксама рэцэнзіі на беларускія выданні. Бібліяграфічныя паведамленні выбарачна дапаўняюцца анатацыямі, дзе звяртаецца ўвага на гістарычны перыяд, геаграфічныя назвы або біяграфічныя звесткі. Усе беларусазнаўчыя матэрыялы знаходзяць адлюстраванне ў дапаможных паказальніках –

** Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74972 (інд.), 749722 (вед.).

персанальным, геаграфічным і прадметным, якія штогод змяшчаюцца ў апошнім нумары выдання. У якасці дадаткаў друкуюцца біяграфічныя спісы або агляды, прысвечаныя значным гістарычным падзеям і актуальным пытанням сучаснага развіцця Беларусі, «Беларускі каляндар, … год», а таксама матэрыялы да юбілеяў выдатных дзеячаў краіны, шэрага арганізацый і ўстаноў, што складаюць аснову эканомікі, культуры, навукі і асветы Беларусі.

Прызначаны ў дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў бібліятэк, іншых культурных і асветных устаноў, а таксама студэнтам, навучэнцам, усім неабыякавым да гісторыі, культуры і сучаснага жыцця сваёй краіны і тым, хто адчувае неабходнасць аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і арганізацыі вольнага часу.

*Тэмы дадаткаў на 2015 г.:*

№ 1. Даты беларускага календара (сакавік – красавік 2015 г.; 8 дат).

№ 2. Даты беларускага календара (май – чэрвень 2015 г.; 8 дат).

№ 3. Да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

№ 4. Брэст – культурная сталіца 2015 г.

№ 5. Даты беларускага календара (ліпень – верасень 2015 г.; 14 дат).

№ 6. Даты беларускага календара (кастрычнік – лістапад 2015 г.; 8 дат).

№ 7. Да 250-годдзя кампазітара, дзяржаўнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага.

№ 8. Беларускі каляндар, 2016 год. Частка 1.

№ 9. Беларускі каляндар, 2016 год. Частка 2.

№ 10. Даты беларускага календара (снежань 2015 г.; студзень – люты 2016 г.; 14 дат).

№ 11. Даты сусветнага календара (юбіляры 2016 года).

№ 12. Дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку».

## 13. **Оформление библиографического списка к научной работе:** методические рекомендации

*Ответственный за выпуск Тулупова Е.В.*




В 2014 г. Высшей аттестационной комиссией Республики Беларусь утверждены новая Инструкция о порядке оформления квалификационной научной работы (диссертации) на соискание ученых степеней кандидата и доктора наук, автореферата и публикаций по теме диссертации и Примеры библиографического описания в списке источников, приводимых в диссертации и автореферате. В пособии учтены изменения, внесенные в данные документы, приводятся рекомендации по составлению библиографических описаний различных видов документов на основе методических решений, принятых в Национальной библиотеке Беларуси.

Издание предназначено для научных сотрудников, аспирантов, соискателей научных степеней, магистрантов, студентов вузов и библиографов.

## 14. **Тураўскае Евангелле = Туровское Евангелие = Turaŭ Gospel:** факсімільнае ўзнаўленне. Даследаванні. 2-е выданне

*Адказны за выпуск Суша А.А.*



Выданне ўпершыню ўзнаўляе самы старажытны кніжны помнік Беларусі – Тураўскае Евангелле XI ст. Факсімільнае выданне рукапісу здзейснена з захаваннем усіх асаблівасцей арыгінала, што дазваляе паўнацэнна прадставіць адзін з самых каштоўных артэфактаў беларускай культуры. Публікацыя суправаджаецца абгрунтаванымі навуковымі каментарыямі, прысвечанымі гісторыі Тураўскай зямлі і самога Тураўскага Евангелля. Ажыццёўлена па благаславенні і пры дзейным удзеле Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

# Электронныя выданні

## 15. **Дакументы і матэрыялы аб дзейнасці Горы-Горацкага земляробчага інстытута:** да 175-годдзя Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*

Электроннае выданне змяшчае бібліяграфічную, фактаграфічную, у тым ліку біяграфічную, інфармацыю; лічбавыя копіі дакументаў і матэрыялаў пра гісторыю дзейнасці Горы-Горацкай земляробчай школы, Горы-Горацкага земляробчага інстытута, горацкіх сярэдніх сельскагаспадарчых устаноў; навукова-гістарычныя артыкулы і даведкі, іншыя матэрыялы.

Выданне падрыхтавана сумесна з бібліятэкай Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў рамках навуковага праекта «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі».

## 16. **Подпольная и партизанская печать Беларуси.** 3-е изд., дополненное

*Ответственный за выпуск Киреева Г.В.*




Электронное издание, посвященное 70-летию освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков, представляет электронные копии подпольной и партизанской печати, которые сохраняются в фондах Национальной библиотеки Беларуси, Музея Великой Отечественной войны, Национального архива Республики Беларусь. Состоит из трех разделов: листовки, журналы, газеты.

Издание будет полезным для исследователей, преподавателей высших и средних учебных заведений, студентов, учащихся и всех, кто интересуется историей Великой Отечественной войны.

## 17. **Рэгіянальная гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах Віленскай археаграфічнай камісіі (1864–1915)**

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*

На кампакт-дыску прадстаўлены бібліяграфічная, паўнатэкставая, фактаграфічная інфармацыя пра гісторыю дзейнасці Віленскай археаграфічнай камісіі, асоб, звязаных з работай установы; лічбавыя копіі зборнікаў актавых дакументаў і іншых выданняў камісіі; суправаджальныя матэрыялы (навуковыя, даведачныя, аўдыявізуальныя).

Выданне прызначана для навуковых работнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў і аспірантаў, краязнаўцаў, бібліятэкараў, супрацоўнікаў музеяў і архіваў, аматараў айчыннай гісторыі.

Падрыхтавана сумесна з кафедрай крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў межах навуковага праекта «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі».

## 18. **Служыць Радзіме…:** да 250-годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833)

*Адказны за выпуск Л.В. Гарбачова*

Электроннае выданне прысвечана жыццю і творчай дзейнасці вядомага дыпламата, кампазітара, палітычнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833), 250-годдзе з дня нараджэння якога ўключана ў спіс юбілейных дат ЮНЕСКА на 2015 г.

На дыску прадстаўлены бібліяграфічныя і фактаграфічныя матэрыялы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю М.К. Агінскага, а таксама электронная калекцыя выданняў, у тым ліку аўдыявізуальных, выяўленчых і архіўных дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі музычнай і тэатральнай культуры, іншых устаноў.

Разлічана на шырокае кола карыстальнікаў, якія цікавяцца гісторыяй і культурай роднага краю.

## КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
## выхаду ў свет інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2015 г.

| № п/п | Выданне | Адказны за выпуск | Выхад у свет |
|---|---|---|---|
| | *ДРУКАВАНЫЯ* | | |
| 1 | Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 7 | Пшыбытка М.Г. | Лістапад |
| 2 | Бібліятэчны свет: часопіс | Кірухіна Л.Г. | 1 раз у 2 месяцы |
| 3 | Георгій Паплаўскі. Гравюры па творах Васіля Быкава: камплект паштовак | Суша А.А. | Май |
| 4 | Дзяцінства светлая пара = Детства светлая пора = Happy Childhood: камплект паштовак. Вып. 2 | Масюк І.П. | Сакавік |
| 5 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 18 | Кірэева Г.У. | Верасень |
| 6 | Кніжныя помнікі Беларусі | Суша А.А. | Верасень |
| 7 | Мастацкая Скарыніяна: Мікалай Байрачны: камплект паштовак | Суша А.А. | Май |
| 8 | Мастацкая Скарыніяна: Язэп Драздовіч: камплект паштовак | Суша А.А. | Красавік |
| 9 | Материалы III Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» | Есіс Н.С. | Кастрычнік |
| 10 | Матэрыялы XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў | Кірэева Г.У. | Красавік |
| 11 | Наталля Паплаўская. Гравюры па творах Івана Мележа: камплект паштовак | Суша А.А. | Май |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 12 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Градоўкіна І.У. | Кожны месяц |
| 13 | Оформление библиографического списка к научной работе: методические рекомендации | Тулупава А.В. | Май |
| 14 | Тураўскае Евангелле = Туровское Евангелие = Turaŭ Gospel: факсімільнае ўзнаўленне. Даследаванні. 2-е выданне | Суша А.А. | Люты |
| | *ЭЛЕКТРОННЫЯ* | | |
| 15 | Дакументы і матэрыялы аб дзейнасці Горы-Горацкага земляробчага інстытута: да 175-годдзя Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі | Градоўкіна І.У. | Чэрвень |
| 16 | Подпольная и партизанская печать Беларуси. 3-е изд., дополненное | Кірэева Г.У. | Люты |
| 17 | Рэгіянальная гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах Віленскай археаграфічнай камісіі (1864–1915) | Градоўкіна І.У. | Снежань |
| 18 | Служыць Радзіме…: да 250-годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833) | Гарбачова Л.В. | Ліпень |



# ПОЛИГРАФИЧЕСКИЕ УСЛУГИ НАЦИОНАЛЬНОЙ БИБЛИОТЕКИ БЕЛАРУСИ

**цифровая печать** (изготовление визитных карточек, конвертов, бейджей, меню для ресторанов, дипломов, сертификатов, наклеек, открыток, приглашений, вкладышей для CD/DVD, дисконтных карт, брошюр, буклетов, блокнотов, календарей, книг, закладок, листовок, флаеров, фотоальбомов);

**широкоформатная печать** (изготовление плакатов, постеров, чертежей);

**ризографическая печать**;

**копировальные работы** (черно-белое и полноцветное копирование, широкоформатное копирование) на оборудовании Xerox 6030 (CD-дисков – 300 шт. в сутки);

**создание мультимедийных изданий** (разработка структурного макета, разработка и согласование дизайна страниц, программное проектирование и тестирование, разработка дизайна обложки диска и накатки на диск);

**тиражирование CD/DVD** (запись на CD/DVD, печать на поверхности CD/DVD, ламинирование поверхности CD/DVD) на оборудовании R-Quest TCA 9200, CD/DVD Print Factory 2 RU;

**редакционно-издательская подготовка** любой сложности;

**послепечатные работы** (переплетные работы: твердый переплет, термоклеевой переплет, переплет на скобу, переплет на пружину на оборудовании RENZ SWR 360, Fellowes PB 2650; ламинирование холодное (ширина до 1260 мм) и горячее (до 1670 мм); биговка; перфорация; резка) на оборудовании Ideal 7228, GMP Exelam, INTROMA BP-500,

**плоттерная резка** (Summa S160T, ширина до 1600 мм);

**сувенирная продукция** (нанесение изображения на майку, кепку, кружку).

Издательский отдел Национальной библиотеки Беларуси оснащен новейшей техникой, позволяющей оперативно и качественно выполнять заказы любой сложности: черно-белая цифровая мини-типография Xerox DT6100, полноцветный цифровой комплекс Xerox 8000, широкоформатный принтер Xerox 8160, инженерная система Xerox 6030 и т. д. Специалисты издательского отдела индивидуально подходят к выполнению каждого заказа.

Дополнительную информацию Вы можете получить по тел./факсу (+375 17) 266 37 23, e-mail: edit@nlb.by.

Надеемся видеть Вас в числе наших клиентов!

# ПРАПАНУЕМ НАБЫЦЬ

## ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Библиотеки Беларуси в цифрах и фактах (1991–2011)

Библиотеки Беларуси: справочник: в 3 т.

Библиографическое описание книжных изданий: практическое пособие

Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 1–6

Буквіцы: камплект паштовак

Вопросы авторского права в деятельности библиотек Беларуси

Грунвальдская бітва ў выявах: па матэрыялах з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: камплект паштовак

Дзяцінства светлая пара = Детство светлая пора = Happy Childhood: камплект паштовак. Вып. 1

Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 13–17

Ініцыялы першых старадрукаў: камплект паштовак

Материалы Международных книговедческих чтений (IX–X)

Материалы Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» (I–II)

Методические рекомендации по формированию библиографических записей на альбомы и атласы

Мінск старадаўні = Minsk in the past: камплект паштовак

Национальная библиотека Беларуси: учебное пособие

Нацыянальная бібліятэка Беларусі = Национальная библиотека Беларуси: рэкламнае выданне

Разработка и внедрение виртуальных сервисов: методическое пособие

Рарытэты з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: камплект паштовак

Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь: по результатам республиканского исследования

# ПРАПАНУЕМ НАБЫЦЬ

## ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ

Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2006–2010)

Беларуская і руская літаратура. У дапамогу навучэнцам. 2-е выданне.

Библиотека Хрептовичей

Запаветны напеў, запаветная даль… Белавежская пушча

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)

Паэт красы і гармоніі: да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891–1917)

Сапегиана: книжное собрание рода Сапег = Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў

Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага: да 150-годдзя з дня нараджэння

Спадчына Юзафа Ігнацыя Крашэўскага

Памятные книжки белорусских губерний (Витебская, Виленская, Гродненская, Минская, Могилевская)

Подпольная и партизанская печать Беларуси

Французские автографы в фонде Национальной библиотеки Беларуси

Radziviliana: дакументальныя помнікі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: іканаграфія Радзівілаў

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ
на 2015 год

Падпісана да друку 09.02.2015. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$. Лічбавы друк.
Умоўн. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,9.
Тыраж 200 экз. Заказ 553.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68.
Факс (+375 17) 266 37 23.
E-mail: edit@nlb.by